**6 верасня ў мастацкай галерэі “Універсітэт культуры” адкрылася выстава “АРТ-АВАНТАЖ, 2010” — своеасаблівы застылы ў часе і прасторы перформанс, адмысловы кампраміс паміж модай і тэатральнасцю, паяднаны парыў аб’ектыва фотамастака і эмоцыі фотамадэлі.**

# Мода як тэатр, адзенне як эмоцыя

Зрэшты, скажам, прасцей: на выставе можна ўбачыць мастацкія фота — плён тэматычных фотасесій у народным тэатры-студыі моды "Авантаж" Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта (фатограф Юрый Кулікоў). Тут жа дэманструюцца і асобныя ўзоры адзення а-ля авантаж.



Тэатр-студыя моды "Авантаж" быў створаны ў 2001 годзе на базе студэнцкага клуба БДЭУ і з таго часу вырас у адну з самых адметных творчых пляцовак гэтай ВНУ. На рахунку дызайнерскай групы тэатра ўжо некалькі дзясяткаў калекцый у розных стылістычных кірунках, а самі дызайнеры неаднойчы паспяхова прымалі ўдзел у розных фестывалях і конкурсах, у тым ліку ў такіх вядомых, як Міжнародны фестываль моды і фота "Млын моды" ў Беларусі, Міжнародны конкурс Высокай моды нацыянальнага касцюма ў Маскве, Міжнародны фестываль тэатраў і студый моды "Модны двор" у Пензе, Міжнародны фестываль студэнцкай творчасці "Мы разам" у Бранску і інш. У 2006 годзе калектыў абараніў ганаровае званне "Народны".

Элементы тэатралізацыі трывала ўвайшлі ў практыку паказаў "Авантажу", бадай, ніводнае дэфіле ўдзельнікаў тэатра не абыходзіцца без пантамімы, харэаграфіі, размоўнага жанру, і ўсё гэта натуральна пераклікаецца з тымі мэтамі, якія ставіць мастацкі кіраўнік калектыву Любоў Шыбаршына: прыцягнуць увагу людзей да прыгажосці пры дапамозе яскравых шоу, не проста паказваць адзенне, а яшчэ і расказваць пры гэтым пра ўласныя эмоцыі і пачуцці, ствараць адметную атмасферу свята, аднолькава прасякнутага хараством дызайну і праніклівасцю тэатра.



Магчыма таму гаварыць пра звычайныя фэшн-фотасесіі у выпадку з тэатрам-студыяй "Авантаж" проста не выпадае — занадта яркія і індывідуальныя вобразы занатаваў сваім фотааб'ектывам Юрый Кулікоў. Іх назвы гавораць самі за сябе: ABDUCTION (выкраданне), INVASION (уварванне), BRUTALITY (жорсткасць), WANDERING (блуканне), TWILIGHT (прыцемкі), REBIRTH (адраджэнне), MISTRESS (каханка), LIAISON (сувязь) і інш. Любоў Шыбаршына так тлумачыць тое, чаму менавіта гэтыя словы "прыйшлі" да адпаведных вобразаў: "Любы вобраз — гэта магчымасць перадаць эмоцыю ці эмоцыі, а любую эмоцыю можна заключыць у адно слова. Ці то словы выбіраюць мастака, ці то эмоцыі, ці то жаданне аб'яднаць усё гэта ў адно цэлае... Але гэта толькі чыйсьці погляд на тое, што ўяўляюць сабой гэтыя словы, — маленькі замерлы на некалькі секунд тэатр, дзе кожная дэталь адыгрывае ўласную ролю".

Няма патрэбы казаць і пра тое, што погляд гледача і погляд фотамастака тут могуць не супадаць.

Выстава будзе працаваць да 18 верасня.

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

## Прагноз надвор'я

Сення днем па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі месцамі па Брэсцкай вобласці кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднева-ўсходні 4—9 м/с, парывы да 14 м/с, па паўднёвым захадзе месцамі парывы да 15—18 м/с. Тэмпература паветра +14 — +19°С.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е.

10.09 пераважна па паўднёва-заходняй палове кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні 5—10 м/с, парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу ад +3°С па паўночным усходзе да +11°С па паўднёвым захадзе, днем +12 — +18°С, па поўдні да +20°С.

11.09 па заходняй палове месцамі кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні 5—10 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу +5 — +12°С, днём +14 — +20°С, па поўдні да +22°С.

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**

**Вниманию преподавателей труда!!!**
ОАО "Электроремонтный завод" Мингорисполкома предлагает **пошив спецодежды для школьников**: халаты и фартуки мальчикам для уроков трудового обучения
**Обращаться по телефонам:**
**(017)-291-93-23; моб. (Велком) 699-26-36.**
УНП 100008169